Государственное учреждение культуры Борисовская центральная районная
БИБЛИОТЕКА
имени Ивана Хрисанфовича Колодеева

# *ШЛЯХ МОЙ НЕ СЦЕЛІЦЦА СОНЦАМ І КВЕТКАМІ...*

ДА 140-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КУПАЛЫ

## ЯНКА КУПАЛА (ІВАН ДАМІНІКАВІЧ ЛУЦЕВІЧ):

**Беларускі паэт і перакладчык, драматург, публіцыст.**
**Класік беларускай літаратуры**
**Народны паэт БССР (1925)**
**Акадэмік АН БССР (1928) і АН УССР**
**Лаурэат Сталінскай прэміі першай ступені (1941)**



Найбольш ранні з вядомых твораў маладога паэта Луцэвіча, напісаны па-беларуску – “Мая доля”, датаваны 15 ліпеня 1904 года. Праз год у менскай газеце “Паўночна-Заходні край” быў надрукаваны верш “Мужык” – першы апублікаваны твор паэта на беларускай мове.

У 1908 годзе Купала пачынае працаваць у рэдакцыі газеты «Наша ніва». У гэтым жа годзе пецярбургскае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца» выпусціла першы зборнік паэта «Жалейка», якую двойчы канфіскоўвалі. Выхад у свет Жалейкі быў успрынят перадавой грамадскасцю як факт асаблівага кльтурна-палітычнага значэння, як новы этап у культурным, нацыянальным жыцці краю.



.





# Мужыкъ!

Што я мужыкъ, усѣ тутъ знаюць,
И, якъ іосць гэты свѣтъ вялікъ,
Зъ мяне смяюцца—нагорджваюць,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Чытаць, писаць я не умѣю;
Не ходзитъ гладка мой языкъ,
Бо тольки вѣчне ору, сѣю,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Бо ў працы свой хлѣбъ добываю,
Бо кожному паклону я звыкъ,
И свята радна калі маю,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Галѣюць дѣци вѣкъ безъ хлѣба,
Подзерты кожухъ, чарвякъ;
Не маю ўрошя, якъ потрэба,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Заліушы потамъ горевымъ вочы,
Чы я малы, чы я старыкъ,
Працую ажъ той волъ рабочы,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Якъ хворъ ды бѣдны—самъ бяруся
Лѣчыць сябѣ—я чараўнякъ!
Бо я безъ дохтура лѣчуся,—
Бо я мужыкъ, дурны мужыкъ!

Што гэмъ я повиненъ згнiць,
Якъ той у лѣсѣ чашчарокъ,
И якъ собака свѣтъ покинуць,
Бо я мужыкъ, дурный мужыкъ!

Але, хоць сколькя жыць тутъ буду,
Няхъ будзе вѣкъ хутъ мой вялiкъ,
Николи, браты, не забуду,
Што чэловѣкъ я, хоць мужыкъ!




## Дзяучынка, галубка мая!

Дзяўчынка, галубка мая!
Кинь весяла вочкам ка мне,
Табой зачарованы я
Любуюсь на яве и ў сне.
  Дзяўчынка, галубка, хадзи
  Ка мне, бо цябе я люблю,
  Сагрэю на белай грудзи,
  Уцехай кахання усплю.
Дзяўчынка, галубка, тады
Забудземся свету, людзей,
Забудземся гора, бяды,
Нядоли забудзем сваей.
  Дзяўчынка, галубка, слязой
  Як скропиш павеку сваю,
  Я вытру, пацешу, як свой,
  И песню табе запяю.
Дзяўчынка, галубка, не дам
С цябе жарты строиць жыццю:
Я буду дзялиць папалам
Нядолю и долю тваю.
  Дзяўчынка, галубка, мой друг,
  Саўйом мы цихое гняздко,
  Дзе створым душу адну з двюх,
  И думы, и сэрцэ адно.
Дзяўчынка, галубка, мы так
Па хвалях жыцця паплывйом,

Другі зборнік вершаў «Гусляр» выдадзены лацінкай у 1910 годзе. У адрозненне ад «Жалейкі» з яе элегічнасцю, плачам над адвечнай нядоляй селяніна, ў «Гусляры» выразна выяўляецца рамантычнае светаадчуванне аўтара, акрэсліваецца філасофская, экспрэсіўная плынь яго лірыкі, паўстае рамантычны вобраз паэта як «сына міра», як прарока, які спазнаў таямніцы свету і жадае данесці іх да людзей..

Зборнік «Гусляр» распачынае філасофскі струмень у беларускай нацыянальнай лірыцы. Агульнафіласофскія, агульначалавечага дыяпазону вершы «Гусляра» сцвярджалі наватарскі характар зборніку, як яшчэ адну значную ступень у развіцці не толькі Купалы-лірыка, але і ўсёй беларускае літаратуры



У паэмах «Курган» (1910), «Бандароўна» (1913), «Магіла льва» (1913), драматычнай паэме «Сон на кургане» (1910), паэме-ідыліі «Яна і я» (1913) ён зарэкамендаваў сябе буйнейншым прадстаўніком нацыянальнага рамантызму. У сімвалічных вобразах і карцінах Янка Купала стварыў шырокае палатно нацыянальнага быцця ў яго сацыяльна-гістарычным зрэзе.

1912 год - Купала завяршыў першую сваю п'есу-камедыю "Паўлінка", якая ў тым жа годзе выдадзена ў Санкт-Пецярбургу, затым пастаўлена на сцэне спачатку ў Пецярбургу, затым у Вільне.




ЯНКА КУПАЛА
КУРГАН


БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ
ЯНКА КУПАЛА
ПАЎЛІНКА

…У ночнай цішы, ў любым упаенні,
У патаенні ад жыцця людзей,
Агонь душу і сэрца распрамене,
Агонь гарачых злучаных грудзей.
І мнагацветныя акружаць нас вясёлкі,
Маланкі залатыя замігцяць,
І думкі нашы, верныя саколкі,
Да неба з доброй весткай паляцяць.
Так мілаванне к шчасцю след адчыне,
А мілаванне – над царамі цар,-
І будзеш век маёю гаспадыняй,
А я твой вечна буду гаспадар.



Творча плённым, узлётным для Я. Купалы быў перыяд 1910—13, які паэт правёў у Санкт-Пецярбургу.
У гэты час выйшаў у свет трэці паэтычны зборнік «Шляхам жыцця» (1913). Зборнік быў фактычна вяршынным дасягненнем тагачаснай беларускай літаратуры, а яго аўтар стаў бясспрэчным яе лідарам. У вершах гэтага выдання выразна выявіўся патрыятызм і глыбінны гістарызм паэта, найбольш яскрава ўвасобілася ідэя свабоды і абуджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Паэт імкнуўся абудзіць у чытача пачуцце гордасці і ўдзячнасці да продкаў, якія былі здольныя захоўваць сваю дзяржаўнасць і незалежнасць, бараніць зямлю ад ворагаў, развіваць адметную культуру



*Шлях мой ня сьцеліцца сонцем і кветкамі,*
*Гладкай, павабнай ня лёг раўнінай,-*
*Паміж неўдалымі ўецца палеткамі,*
*Ўецца зімой і вясной.*

*Вечэр і ночка закрылі мне раніцу,*
*Ўхуталі плесьняй, сівым туманом,*
*Даль-жэ нязбытаю казкай туманіцца,*
*Казкай, негаданым сном…*

*Вера ў дзень заўтрашні сілай няведамай*
*Думы гартуе ісьці не чэкаць,*
*Хоць бы там здыдні плот ставілі бедамі,*
*Бедамі клікалі спаць…*



П’еса “Тутэйшыя”(1913) прынясе Янку Купалу гонар і славу, праўда, праз дзесяцігоддзі.
Ён тонка і дакладна адчуваў глыбінную сутнасць перамен у грамадстве і нацыянальнай свядомасці.
У аснове п'есы - гістарычныя шляхі і будучыня беларускага народа. У п'есе Купала паказвае Беларусь нібыта распятай паміж Расіяй і Польшчай. Ён выказвае глыбокую трывогу за духоўную спадчыну беларускага народа, яго нацыянальную свядомасць.
.



Увосень 1913 года Купала вярнуўся ў Вільню

1914 – пачатак Першай сусветнай вайны, Купала становіцца рэдактарам газеты “Наша ніва”. Яго, вялікага гуманіста, вельмі непакоіла, раніла у самае сэрца тое, што вайна прынесла з сабой смерць і няшчасце працоўнаму люду.

Эпіграф, узяты Купалай з народнай песні да цыклу вершаў “Песні вайны”:

*“Вазьмі, маці, пяску жменю,*
*Пасей, маці, на каменю.*
*Як прыждешся з пяску ўсходу,*
*Тады верне сын з паходу…”*

Ваенныя абставіны надзвычайна ускладнілі выпуск “Нашай нівы”. “Штораз часцей на старонках газеты белыя плямы: цэнзура лютуе..” – з успамінаў Паўліны Мядзёлкі



1919: пасля абвяшчэння БССР пераехаў на сталае жыхарства ў Мінск. Працаваў загадчыкам бібліятэкі пры Беларускай хатцы, рэдагаваў часопіс «Рунь» (1920) і «Вольны сцяг» (1920-22).
З пачатку 1921 - намеснік загадчыка літаратурна-выдавецкага аддзела Наркамасветы БССР, уваходзіў у склад Акададэмічнай камісіі Акадэмічнага цэнтра Наркамасветы БССР па ўкладанні і апрацоўцы беларускай тэрміналогіі, член навукова-рэдакцыйнай калегіі Наркамасветы БССР. На працягу двух наступных дзесяцігоддзяў выходзілі ў свет наступныя лірычныя зборнікі паэта: «Спадчына» (1922), «Безыменная» (1925), «Песня будаўніцтву» (1936), «Беларусі ардэнаноснай» (1937 ), "Ад сэрца" (1940), паэмы "Над ракой Арэсай" (1933), "Тарасава доля" (1939).



*Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына;*
*Паміж сваіх і чужакоў*
*Яна мне ласкай матчынай.*

*Аб ёй мне баюць казкі-сны*
*Вясеннія прапаліны,*
*І лесу шэлест верасны,*
*І ў полі дуб апалены.*

*Аб ёй мне будзіць успамін*
*На ліпе бусел клёкатам*
*І той стары амшалы тын,*
*Што лёг ля вёсак покатам…*



# Першыя выданні твораў Янкі Купалы









З 1944 года дзейнічае Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы. У гонар паэта ў 1957 годзе была заснавана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы. З 1995 года сістэматычна праводзяцца штогадовыя Купалаўскія чытанні — прафесійны форум для абмеркавання навуковых дасягненняў і праблем купалазнаўства. У 1996 годзе быў створаны Міжнародны фонд Янкі Купалы. Імем паэта названы Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, парк у Мінску і станцыя мінскага метрапалітэна, мноства вуліц у гарадах Рэспублікі Беларусь.



.

Луцэвічы, продкі Янкі Купалы мелі сямейны герб. Ен называўся па-рознаму – Навіна, Войня, Златагаленчык.
У цэнтры герба – блакітны шчыт, на ім срэбныя падкова і срэбны меч с залатой рукаяткай. Над шчытом шляхецкая карона і сагнутая ў калене залатая нага ў латах і са шпораю.



З артыкулу Уладзіміра Ліпсакага:

“У старажытных геральдычных кнігах я адшукаў такую легенду. Там сцвярджаецца, што кароль польскі Баляслаў III Крывавусты упершыню надаў гэты герб у 1121 аднаму свайму ротмістру. Прозвішча яго не захавалася, але учынак ротмістра жыве праз вякі. Нібыта той адважны ротмістр двойчы ратаваў свайго караля. Аднойчы, рызыкуючы жыццём, замяніў параненага пад каралём каня сваім баявым канём. А другі раз, калі кароль і ротмістр трапілі ў палон і былі закованыя у адну калодку-кайданы, вой не пашкадаваў сваёй нагі, адсек яе і гэтак вызваліў караля. Можа таму і аздабляюць шчыт герба меч адважнага воя і падкова баявога каня?

Але у гербе ёсць яшчэ адзін сімвал. Карона, шлем і шчыт аздоблены прыгожымі стужкамі. Чым больш узіраюся на іх, тым больш мне здаецца, што яны падобны да лісця папараці. Можа далёкія прашчуры Купалы верылі ў дзівосную казку пра чароўныя кветкі папараці, якія з’яўляюцца зорнай ноччу на Івана Купалу? Можа яны нястомна маліліся, каб у іх родзе калі-небудзь з’явіўся той шчаслівы, які ашукае ў рэшце таемную кветку папараці і уславіць увесь іх род?”

Выстава падрыхтавана бібліятэкарам абанямента цэнтральнай бібліятэкі Ірынай Шапавалавай
Выставка подготовлена библиотекарем абонемента центральной библиотеки  Ириной Шаповаловой